8 91.72-3
K 95

Алесь Кучар

# НА ПАРТЫЗАНСКАЙ ЗЯМЛІ

ВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б
«СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ»

891.79-3
К 95

АЛЕСЬ КУЧАР

# НА ПАРТЫЗАНСКАЙ ЗЯМЛІ

2069

ВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б
«СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ»
1943

Бібліятэка Урадавая БССР
біб. СНК

Бр. Н. Н.
891.72-3
К 95

АЛЕСЬ КУЧАР

# НА ПАРТЫЗАНСКАЙ ЗЯМЛІ

4770 519

ВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б
«СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ»
1943

Урадавая Бібліятэка БССР імя А. М. Горкага
Пам. праверка 1949 г.

Б.е.н.к
891.72-3
К 95

АЛЕСЬ КУЧАР

# НА ПАРТЫЗАНСКАЙ ЗЯМЛІ

Урадавая бібліятэка БССР імя А. М. Горкага

ВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б
«СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ»
1943

...1945 г.

## РОДНЫЯ МЯСЦІНЫ

Чым бліжэй да Беларусі, тым большае хваляванне ахоплівае нас. Ужо шмат часу, як мы пакінулі гэтыя мясціны, дзе засталася частка нашага сэрца.

Вось яна—перадавая лінія фронта. Збоку, за два кілометры ад дарогі, відаць гарадок, блакіраваны часцямі Чырвонай Арміі. Гарадок ляжыць у лагчыне, зззяе белымі цэрквамі, і адтуль безупынна даносіцца грукат гармат і мінамётаў.

— Гэтая вышыня абстрэльваецца немцамі!— папярэджвае нас камандзір Чырвонай Арміі.— Калі будуць страляць — лажыцца!

Мы ўздымаемся на ўзвышша. Сёння тут спакойна, але вышка, якая знаходзіцца на гары, пашчапана мінамі і кулямі.

Ва ўсім ужо адчуваецца Беларусь. У гутарцы дзяцей, якія спакойна вандруюць каля самага пекла баёў, і ў пейзажы, і ў выглядзе вёсак.

Там, за лініяй фронта, пачынаюцца ўладанні партызан.

— Тут партызанская зямля, і цягнецца яна на добрую сотню кілометраў, аж да горада В.,—кажа камісар партызанскіх атрадаў таварыш Рычард Ш.

Па дарозе сустракаем грамаду мужчын. З добра наладаванымі торбамі ідуць яны з занятых немцамі раёнаў Беларусі.

— Куды?

— Вядома куды, у Чырвоную Армію! Не паспелі раней адмабілізавацца, вось ідзем цяпер!—адказаў чалавек у капялюшы, відаць, вясковы настаўнік.

— А хто-ж вас суправаджае?

— А хіба мы самі ісці не ўмеем? Ніхто нас не суправаджае!

— Што чуваць у вашым раёне?

— Дзіва, што будзе чуваць, калі ўсю ноч гарыць і грыміць! — адказаў малады, бойкі хлапец.

— А што-ж там гарэла і грымела?—з усмешкай запытаўся камісар партызанскіх атрадаў.

— Вядома што! Партызаны ўначы падпалілі нямецкія склады і ўзарвалі бакі з бензінам. Але бачу, што вы лепш за нас пра гэта ведаеце!—хітра падміргнуў ён камісару атрада. Ці не наш партызанскі камісар будзеце?

— Угадаў!

— А то я бачу, вы ўсё пытаеце, а самі ўсміхаецеся!

Сустракаем падводу. На ёй захутаны ў кажухі ляжыць малады бледнатвары хлопец. Ён цяжка дыхае. Камісар заспяшаўся да падводы.

— Сцяпан?!—ледзь не крыкнуў ён. —Што з табой?

— Не пашанцавала, таварыш камісар!—адказаў падводчык. —Цяжка паранілі яго. Усё трызніць і кідаецца на возе.

— Гэта залаты хлопец!—кажа нам камісар.— Ён і два яго сябры, Серафім і Пятро, уладавалі кулямёт на царкве і шэсць дзён не пускалі немцаў у вёску.

— Але жыць павінен,—разважліва, як-бы сам сабе, сказаў падводчык-партызан,—бо рану адчувае і нават крычыць, калі на выбоінах пачынае кідаць калёсы.

З жалем мы праходзім міма параненага героя-партызана.

Ідзём далей. Ужо 30 кіламетраў прайшлі пехатой, ныюць ногі.

— Вось тут, за гэтым мосцікам пачынаецца Беларусь!—кажа таварыш Рычард Ш.

Выходзім на шырокі прасторны бальшак, абсаджаны бярозамі. Гэта славуты екацярынінскі шлях. Вось яна—наша прыгажуня Беларусь. З дрымотнымі лясамі, з шырокімі нівамі, цяпер ізноў пакрамсанымі на вузкія па-

лоскі. Паабапал ляжаць руіны. Але гэта зямля да болю люба нашаму сэрцу. Лясы стаяць маўкліва і ўрачыста. Густыя фарбы на галінах елак і сосен перамешваюцца з празрыстай, кволай зелянінай бярозавых лістоў. Заходзіць сонца. Чутны птушыныя галасы. Праўда, рэдка сустрэнеш бусла. Многія вёскі спалены, а з імі і гнёзды птушак. Калі гняздо разбурана, бусел назаўсёды пакідае ранейшыя мясціны.

Па дарозе часцей пачалі трапляцца перакуленыя, прабітыя кулямі нямецкія машыны. Камісар з гордасцю гаворыць:

— Гэта работа хлопцаў бацькі Міная.

У вёсцы мы на колькі хвілін спыняемся. Камісар падыходзіць да акна і пытае:

— Цётка, а ці ёсць у вас берка?

Так завуць тут квас—бярозавік.

— Ёсць, ёсць! Заходзьце, сынкі!

Нас сустракае старая жанчына. Замест беркі яна прапануе нам малака.

— Вы-ж змарыліся, перакусілі-б, дарога-ж мусіць не малая!

У хаце змрок.

— А дзе-ж ваш Раман?—пытае камісар.

— Які Раман?—разгублена сказала жанчына.

— А сын?..

— А хто яго ведае! Недзе ў лес пайшоў, галля сабраць крыху.

— А можа ў партызанах ён? — задзірліва запытаўся камісар.

— Не... не...—пачала аднекавацца жанчына.

— А ці вы, цётка, не пазналі мяне? Я-ж камісар!

— А ліханька на цябе,—адказала павесялелая жанчына. —А далібог-жа не пазнала! Пры чужым чалавеку пытае пра Рамана.

— Вітаю вас, цётка, Раман узнагароджаны высокай узнагародай — ордэнам Чырвонага Сцягу!

— Добра, добра, сынок, але няма бацькі, няма каму парадавацца!

Жанчына заплакала.

— Кіньце, мама! Ці мала вы плакалі ўжо? А ці пусціце-ж брата дамоў? — перарвала дачка, звяртаючыся да камісара.

— Заўтра-ж адведае матку,—адказаў камісар.—Дзякую за берку, бывайце!

Па дарозе камісар расказаў гісторыю Рамана М.

Зімою ён уначы прабраўся ў родную вёску, каб выведаць, ці ёсць тут немцы. У першай хаце, у якую ён пастукаў, здраднік-вырадак заспакоіў яго—немцаў няма. Раман пайшоў у сваю хату. Па дарозе яго схапілі два фашысты. Абшукалі, але рэвальвера, які быў пад кажухом, не знайшлі. Уперадзе ішоў адзін канваір, ззаду другі. Цемра, хоць вока выкалі. Раман адхінуў крысо кажуха, дастаў рэ-

вальвер і выстраліў пярэдняму канваіру ў патыліцу, потым абярнуўся і выстраліў у твар другому немцу, а сам знік. Назаўтра, па даносу здрадніка, быў расстраляны яго бацька, а сям'і прыгразілі, што з ёй будзе тое самае, калі Раман хоць раз яшчэ з'явіцца ў вёску. Раман жорстка адпомсціў за смерць бацькі. Не адзін дзесятак нямецкіх бандытаў ён забіў у баях.

Позна мы прыходзім у штаб атрадаў. Усе на сваіх месцах. Начальнік штаба, светлавалосы, прыгожы, па вайсковаму ахайны і ладны чалавек, дзяжурыць каля тэлефона. Тут-жа знаходзіцца сувязны—Пеця, хлопчык гадоў 14. Я ўважліва ўглядаюся ў зусім юнага, каротка падстрыжанага хлопчыка, і ў яго твары мільгаюць дзявочыя рысы.

— А ну, Пеця, пакліч мне начальніка каравула!—звяртаецца начштаба да сувязнога.

— Ёсць!—коратка адказаў Пеця, узяў вінтоўку і выйшаў.

— Сапраўднае імя гэтага Пеці—Клава,— кажа начштаба. — Смелая дзяўчынка. Вельмі пакрыўджана сёння на мяне, што я не пусціў яе на аперацыю. У нас усе яе завуць Пеця, і сама яна заве сябе Пеця.

Раптам зазваніў тэлефон.

— Таварыш начштаба! Разведка данесла— каля 100 немцаў з мінамётамі і кулямётамі,

ёсць сярод іх кавалерысты, рвуцца на бальшак, у раён, заняты партызанамі.

Начштаба загадвае:

— Выслаць узвод на чале з Раманам на дарогу. Аўтаматным і кулямётным агнём немца рассеяць, на тэрыторыю, занятую намі, не пускаць. Мне званіць!

Кароткі адказ:

— Будзе выканана!

## БАЦЬКА-МІНАЙ

У штабе мы пазнаёміліся з бацькам Мінаем. Ён зграбны і стройны, не гледзячы на немаладыя гады. Твар у яго ласкавы і добры. На ім ляглі шматлікія цяжкія змаршчакі.

З гутарак з бацькам Мінаем, з размоў з яго сябрамі і памочнікамі паўстае жыццё гэтага нязломнага чалавека. Па-першае, гэта жыццё воіна — бацька Мінай стары артылерыст, не кепска ваяваў у 1914 годзе і быў, нават, узнагароджаны георгіеўскім крыжам. Радавіты парабак, ён хутчэй душой, чым свядомасцю адчуў велічную праўду слоў Ільіча і ўступіў у рады бальшэвіцкай партыі ў першыя гады Кастрычніка.

Калі Ільіч кінуў кліч: «Соцыялістычная бацькаўшчына ў небяспецы», Мінай зноў пайшоў

на фронт, ваяваў з шматлікімі ворагамі, прайшоў з баямі ад Мінска да Роўна, потым змагаўся з акупантамі ў партызанскіх атрадах, вынішчаў бандытаў у сваёй роднай мясцовасці. За баявыя подвігі ён быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцягу.

Напад на нашу радзіму нямецкіх акупантаў застаў бацьку Мінная на гаспадарчай рабоце. Калі фашысты занялі яго родную мясцовасць, ён клікнуў кліч, і за ім пайшлі і яго старыя сябры, якія разам з ім ваявалі ў грамадзянскую вайну, і моладзь, якая паважала яго і любіла.

— 12 ліпеня,—гаворыць бацька Мінай,—я, развітаўшыся з сваімі дзецьмі—чатырнаццацігадовай Лізай, дзесяцігадовым Сяргеем, сямігадовай Зінай і маім любімцам, трохгадовым Мішам, пайшоў у лес.

Цяжка было пакідаць дзяцей, маці іх памерла ў 1940 годзе. Але яны ахвотна згадзіліся застацца ў маёй сястры Ганны.

Ліза ў апошнюю хвіліну развітання падышла да мяне і не па-дзіцячаму сур'ёзна, ціха сказала:

— Ідзі, тата, я паберагу малых!

Міша быў асабліва вясёлы і бесклапотны. Ён усё крычаў:

— Ты пойдзеш у лес, тата, дык прывядзі мне мядзведзя Мішку. Тады ў нас будуць два Мішкі!

Бацька Мінай змаўкае. Вочы яго на хвіліну затуманьваюцца, і ён гаворыць глуха, як-бы да сябе:

— Больш я іх ужо і не ўбачыў.

Потым ён перамагае сябе і расказвае далей:

— Вы ехалі па дарозе і бачылі шмат перакуленых і прастрэленых машын. Гэта наша работа. Не магу перадаць таго пачуцця, якое ахапіла мяне, калі я ўпершыню ўбачыў, як паспадарску ўпэўнена нямецкая сволач адпачывала на лужку каля маёй роднай вёскі. Яны былі голыя—купаліся, раўлі, дурэлі. Зрок мой затуманіўся ад велізарнай нянавісці, і я амаль крыкнуў: «кулямёт!». Загаварыў кулямёт. Як-жа лёгка зрабілася ў мяне на душы, калі я ўбачыў, як яны голыя паўзлі і беглі, якаталі і вылі, кідаліся ў рэчку і ў траву... Тады я ўпершыню спазнаў, што такое задаволеная помста нямецкай навалачы за кроў і смерць, якія яны пасеялі на нашай зямлі... А далей пайшло ўсё, як належыць. 20 ліпеня мы ўзарвалі машыну з палівам, потым узарвалі 7 мастоў на важным тракце. Другі тракт стаў непраходным для немцаў і на ім з'явіўся надпіс: «Дарога запартызанена». А калі і спрабаваў праязджаць які-небудзь абоз, дык у суправаджэнні танкаў. 12 верасня, роўна праз два месяцы пасля таго, як пайшлі партызаніць, мы ўварваліся ў раённы цэнтр, перабілі нямецкі гарнізон, забілі правакатараў,

забралі 5 скрынак масла, пабылі ў горадзе да раніцы, спусцілі паром, разбурылі масты і зноў вярнуліся ў лес.

К гэтаму часу ў нас ужо быў салідны рахунак знішчаных фрыцаў: 250 салдат, 49 афіцэраў, шмат спаленых мастоў. Аднаго разу мы забілі генерала і 2 афіцэраў. Тое, што гэта быў генерал, было відаць з дакументаў і генеральскага мундзіра, які хлопцы ўзялі з сабой.

З набліжэннем восені і зімы наша змаганне станавілася ўсё больш напружаным і цяжкім. Лес—наш надзейны абаронца і прытулак, агаліўся. За намі ганяліся немцы і іх найміты.

Аднойчы партызан, вярнуўшыся з вёскі, смутна паглядзеў на мяне і ціха сказаў:

— Бацька, цяжкая навіна! Дзяцей тваіх забралі немцы заложнікамі.

Ува мне ўсё пахаладзела.

— Як, і меншых?..—запытаў я.

— Усіх, бацька... І сястру Ганну забралі... Усюды вывешаны абвесткі: калі бацька Мінай з'явіцца да нямецкіх улад—адпусцім дзяцей, інакш яны будуць расстраляны. За тваю галаву, бацька, аб'яўлена ўзнагарода—25 тысяч рублёў.

Цяжкая гэта была для мяне ноч. Як жывыя стаялі перада мной дзеці... І цяпер кожную ноч я не магу заснуць...

Бацька Мінай схіляе галаву, і цяжкая сляза бяжыць па яго твару.

— Дзеці мае,—думаў я,—каб вы былі большыя, вы зразумелі-б мяне. Я аддаў-бы жыццё за ўсіх вас і за кожнага паасобку... Але сотні жыццяў мне даручана, не магу я іх аддаць на пакуты. Ды хіба гэта дапамагло-б?! Няма ні мне, ні вам, дзеці, жыцця на адной зямлі з нямецкім катам.

Надыйшлі цяжкія дні для нашага атрада. Мы жылі ў зямлянках, харчаваліся толькі параным збожжам. Аднойчы на зямлянку, дзе знаходзіўся я з невялікай групай таварышоў, напала каля 200 немцаў і некалькі паліцэйскіх. Мы былі галодныя: дзень да гэтага не елі, нічога не елі і ў гэты дзень. Нас было 4 чалавекі. Мы адстрэльваліся, адступаючы па глыбокім снезе. Але вось забіты наш таварыш Палубінскі, забіта яго жонка—Палубінская, паў таварыш Кудзельскі... Я з аўтаматам застаўся адзін супроць масы фашыстаў, якія раўлі і насядалі на мяне. У мяне быў усяго адзін дыск для аўтамата. Я страляў рэдка, безупынна мяняючы пазіцыі. Раптам адзін паліцэйскі зароў:

— Хлопцы, паны немцы, наперад! Ён адзін тут!

Але не паспеў ён і кроку ступіць, як зваліўся мёртвы.

Ад самага рання да позняй ночы я змагаў-

ся супроць банды, пераходзячы з месца на месца, аж пакуль не адарваўся ад сваіх ворагаў і не знік толькі мне аднаму знаёмымі ў лесе сцежкамі.

Змораны, галодны, сярод лясной глушы я прысеў на здохлага каня, якіх нямала пасеялі тут немцы, каб закурыць. Кругом вылі ваўкі, насядаючы на здыхляціну. А я думаў:

— Хто цяпер воўка пабаіцца, калі немец горш воўка!

Позна ўначы я асцярожна пастукаў у хату да маёй 90-гадовай маці. Мне адчынілі. Я палез на печ. Высахлая маленькая жанчына гладзіла мяне, як дзіцё, па галаве, плакала і ўсё шаптала:

— Мучылі, дапытвалі мяне немцы. Няма, сынок, тваіх дзетак... Застрэлілі іх у мястэчку ўчора. Міша, малы, відаць, не здагадваўся, што з імі будзе, ён усё суцяшаў большых:

— Чаго вы плачаце, дурныя, гэта-ж фашысты! Усёроўна мамкі ў нас няма, а татка іх усіх паб'е!

Сэрца маё скамянела ад гора, і я ўсю ноч сухімі вачыма глядзеў у адзін пункт, не ведаючы, як я пачну заўтрашні дзень.

Аднак, заўтрашні дзень я пачаў, як трэба. Праз майго старога таварыша Ісака я сабраў сваіх партызан, якія былі падзелены на дробныя групы. Я ім сказаў коратка:

— Вы ведаеце, хлопцы, якое ў мяне гора. Я нішчу ворага, але я пальцам не крану дзіцяці. Вы зразумейце мяне, калі я буду жорсткі...

Хлопцы мяне зразумелі. І ўжо ніхто з тых часоў не можа дакладна палічыць, колькі нямецкіх галоў скацілася ад рук маіх партызан. А колькі разоў мы выратоўвалі цэлыя вёскі ад нямецкіх грабежнікаў.

Нямала дабра і нам людзі зрабілі. Было так, што мае хлопцы заначуюць у вёсцы і іх там заспее немец. Выстрайвае ўсю вёску—ад малога да старога. Маладзіцы станавіліся ў пары з нашымі партызанамі. «Гэта хто?»,—пытаў іх немец.

— Не чапай!—адказвала грозна жанчына,—мой мужык!

Дзеці зімой з венікам ішлі па нашых сцежках і замяталі сляды, або лапкамі яловымі закідалі іх, каб немец нас не высачыў.

Потым наш атрад на столькі вырас і ўзмацнеў, што мы пачалі адваёўваць у немцаў тэрыторыю. Спачатку адваявалі 5 сельсоветаў, а цяпер маем ужо аж 15 сельсоветаў. На партызанскай зямлі своечасова засеяна поле. Мы дапамагаем сялянам, якіх абрабавалі фашысты, конямі, насеннем. А якія ў нас хлопцы! Чулі вы пра нашага малайца Рамана?

— Чуў.

— Вось гэта хлопец!

— А пра Лену К. чулі? Хлопцы трохі здрэйфілі ў баю і падаліся назад, дык яна іх вылаяла добра, ды сама першая кінулася наперад. Ім брыдка стала, дык і яны наперад... А Івана, Івана нашага не бачылі яшчэ? Ён хоць кульгавы, але такі пагнаў 60 немцаў. Узялі былі мы яго на гаспадарчую работу ў штаб, дык дзе там, збег! І цяпер на перадавой сядзіць.

Тут нашу гутарку перарваў званок.

— Алё! Гэта «Маланка»? Гаворыць «Омск». Бацька Мінай, прадстаўленне гатова, прыязджай!

— Што гэта за прадстаўленне?—пацікавіўся я.

— А гэта мае хлопцы будуць біць з гарматы па гарадку, у якім заселі немцы. Дык трэба паехаць паглядзець.

Бацька Мінай адзяе лёгкую вайсковую шапку, садзіцца на нямецкі веласіпед і едзе ў атрад ордэнаносца Рыгора Курмялёва.

## «АРТЫЛЕРЫЯ, АГОНЬ!»

У атрадзе ордэнаносца Рыгора Курмялёва каля гармат кіпела работа. Вопытная рука артылерыста адчувалася яшчэ далёка ад месца, дзе знаходзіліся гарматы. На полі ўсюды былі

пастаўлены кардонныя макеты гармат, яны былі нават замаскіраваны дрэўцамі. Да ўсеагульнай радасці партызан, немец не раз ужо бамбіў гэтыя кардонныя макеты.

Сапраўдныя гарматы знаходзіліся на ўскраі лесу і цяпер іх жэрлы асабліва грозна паглядалі ў бок ворага. Каля цяжкай гарматы завіхаўся «галоўны артылерыйскі майстар» Рыгор Фёдаравіч Ш. Наглядчыкі і карэктыроўшчыкі размясціліся на дрэвах.

— Бацька прыехаў! — сказаў Курмялёў. — Можам пачынаць, «генерал ад артылерыі»!

Раптам зямля ўздрыганулася ад моцнага выбуху—гэта быў пасланы першы цяжкі снарад у буйны населены пункт. За ім паслалі другі і трэці снарад. Наглядальнікі адзначылі густы слуп дыму, які заслаў паселішча.

— Трапна б'еш!—залюбаваўся бацька Мінай, стары артылерыст, работай Рыгора Фёдаравіча Ш.—А ну, пачастуй іх яшчэ некалькімі снарадамі і на сёння будзе годзе!

Гармата выстраліла яшчэ некалькі разоў.

— А цяпер, хлопцы, нам няма чаго тут рабіць,—сказаў бацька Мінай.—Пойдзем у свае дзоты і пабачым, як будзе шалець немец.

Сапраўды, праз некаторы час, напужаны і, як потым высветлілася, выгнаны гарматным абстрэлам з населенага пункту, немец апамятаваўся і пачаў паліваць месца, адкуль стра-

лялі, мінамётным і гарматным агнём. Але шкоды ніякай не прычыніў.

— Ну, што-ж, заўтра паўторым з гармат большага калібру!

— Праўда, Рыгор Фёдаравіч? — запытаў камандзір атрада.

— Гэта можна!

Рыгор Фёдаравіч Ш. у атрадзе майстар на ўсе рукі. Ён і гарматы раманатаваў, сабраў шмат кінутага немцамі пораху — рабіў сам набоі для гармат, разам з таварышамі адраманатаваў танкі, якія здабылі партызаны. Рыгор Фёдаравіч часта дапамагае майстрам рабіць мінамёты. У партызан наладжаны выпуск мінамётаў.

— Прасцей няма штукі за мінамёт! — кажа Рыгор Фёдаравіч. — Дай мне трубку належнага памеру, і я табе зраблю такі мінамёт, што ты залюбуешся.

Атрад Рыгора Курмялёва вёў абарончыя баі супроць немцаў, якія імкнуліся выбіць партызан з ускраіны лесу і вёскі. Але ўсе намаганні немцаў засталіся марнымі. Партызаны добра акапаліся, заселі ў дзоты і не адступалі ні на крок. Партызанскія пазіцыі знаходзіліся за 30—40 метраў ад нямецкіх дзотаў, так што нярэдка балбатлівыя немцы прабавалі агітаваць партызанаў. Як кажа Лена, «браць на пушку». Адзін афіцэр усё крычаў з дзота на ломанай рускай мове:

— Партызайн! Здавайлься! Капут!
Лена адказала яму:
— Сам здавайся! Табе будзе капут!
Тады афіцэр пачаў дражніць партызан, надзеў на палец каску і вадзіў па дзоту, каля амбразуры. А партызан Воранаў злажыўся ды і забіў таго немца.
Дужа ўзлаваліся фашысты. Яны пачалі шалёна страляць з мінамётаў, кулямётаў і аўтаматаў. Потым кінуліся ў атаку. Нашы партызаны не чакалі такога напору і падаліся назад. Тады наперад выскачыла Лена К. Яна закрычала партызанам:
— Куды вы, сукіны сыны!
— Дык там-жа ад мін няма куды дзецца! — адказаў нейкі навічок-партызан.
— Пойдзем са мной, я пакажу табе, куды дзяюцца ад мін! — І Лена кінулася з вінтоўкай наперад. Яе парыў падтрымалі ўсе партызаны. На 40 метраў яны былі адступілі ў той дзень і вярнулі страчаныя пазіцыі.
Пры ўваходзе ў штаб атрада нас затрымаў вартавы ў нямецкім мундзірчыку.
— Пропуск! Поняў?
— Поняў, але мне трэба да камандзіра атрада!
— Не магу! Пропуск! Поняў? Мы не прапускаем!
— Хто-ж ты такі будзеш, што ў нямецкую форму апрануты?

— Я снайпер Кайнула У.! Поняў? Я тут раблю дзве справы. На варце стаю і нямецкую стрыказу хачу збіць з снайперскай вінтоўкі. Поняў?

Пра Кайнулу У. я шмат чуў у штабе бацькі Міная. На яго бягучым рахунку каля 70 знішчаных фашыстаў. Гэта ён патрабаваў, каб яму прызначылі «журы» для засведчання вынікаў яго «работы». Заўтра ён зноў збіраўся ісці ў снайперскую засаду. Але сустрэцца з Кайнулам мне ўжо давялося значна пазней, у медпункце атрада. На гэты раз яму не пашанцавала. Немец прастрэліў яму нагу. Але Кайнула не пакінуў свае каштоўнае снайперскае вінтоўкі, а, перамагаючы боль, нёс яе з сабой і не супакоіўся, пакуль не ўручыў камандзіру атрада.

У партызанскія атрады за апошнія часы прыйшло шмат беларускіх дзяўчат. Партызанка Поля В. — здаровая, маладая беларуская дзяўчына, ніяк не можа адказаць на пытанне, чаму яна ўступіла ў партызанскі атрад.

— Уступіла — вось і ўсё...

Нарэшце Поля траціць раўнавагу.

— Не разумееце?! А потым-жа трэба гнаць нямецкую брыду з нашай зямлі.

Поля наадрэз адказалася быць медыцынскай сястрой. Гэта прафесія, наогул, не ў пашане ў партызанак. Усе хочуць быць байцамі. Поля храбра сябе трымала ў баях, гранатай

і вінтоўкай знішчала немцаў. У апошнім баю ёй, як і Кайнуле У., не пашанцавала, яна была паранена разрыўной куляй у плячо.

Матруна К. — незамянімая разведчыца. Аднойчы яна ўзялася быць правадніцай нямецкага абозу і прывяла яго ў размяшчэнне партызанскага атрада. Калі немцы здагадаліся ў чым справа, яны адкрылі па адважнай разведчыцы агонь, але яна знікла. Абоз быў часткова знішчаны, часткова захоплены партызанамі.

Матруна К. знаходзіцца ўвесь час на перадавой пазіцыі.

У атрадзе Рыгора Курмялёва ваююць два браты — Іван Фёдаравіч Ч. і Змітра Фёдаравіч Ч. Брат іх, Міхаіл, стаў паліцэйскім. Два браты-партызаны напісалі яму гнеўнае пісьмо. Яны пішуць:

«І пры першай-жа сустрэчы з табой першы-ж зарад нашай зброі будзе пушчаны па табе. Не здрыганецца рука, бо мы будзем упэўнены, што забілі здрадніка. Так будзе, калі сустрэнем цябе ў форме іуды-паліцэйскага».

Гэтая варожасць братоў апраўдана:

«Ці ты не бачыш, здраднік, — пішуць браты, — што там, дзе красаваліся нашы вёскі і гарады, там цяпер гуляе вецер. Каля абгарэлых каміноў і на руінах, як галавешкі, валяюцца абгарэлыя косці тваіх беларускіх бра-

тоў і сясцёр, дзяцей, жывымі кінутых у агонь. Чаму фашысцкія звяры здзекуюцца з нашага народу? Таму, што гэта ненасытныя звяругі, якія харчуюцца чалавечым мясам, без усякіх прыпраў».

«Калі ты ўзяў сумленне ў сваіх родных братоў, апамятайся і вярніся да нас.

Пакуль не позна, прыходзь у наш партызанскі атрад».

Браты вераць, што іх слова дойдзе да сэрца Міхаіла.

Сярод партызан ёсць ужо дзесяткі былых паліцэйскіх, якія раней ці прымусова, ці ашуканствам былі загнаны немцамі ў «паліцаі». Цяпер яны чэсна і самаахвярна ваююць супроць ненавіснай нямецкай сволачы.

Нярэдка немцы займаюцца правакацыяй. Яны падсылаюць у атрады шпіёнаў.

Сёння быў суд над такім здраднікам, які ўшыўся ў атрад. У часе сутычкі з ворагам ён кінуў каштоўную зброю, міны і, з крыкам «ратуйцеся», пабег. Партызаны, якія былі з ім у баю, са здзіўленнем глядзелі на «вар'ята». Аказваецца, гэта быў падасланы немцамі шпіён, правакатар.

Сурова і нерухома стаялі партызанскія рады. Камандзір атрада коратка сказаў:

— Здраднік запляміў наш гонар. Які будзе прысуд, партызаны?

— Выракся прысягі — смерць! — азваўся голас з радоў.

— Смерць! — было напісана на суровых тварах і вусны сказалі:

— Смерць!

Здраднік не прасіў літасці, страшней за смерць былі яму гнеўныя твары, якія з нянавісцю глядзелі на яго.

Камандзір атрада выняў рэвальвер і выстраліў у правакатара.

Поўныя агіды пайшлі партызаны, не паглядзеўшы нават на труп сабакі-здрадніка.

## У АТРАДЗЕ АЛЯКСЕЯ І ДАНІЛЫ

Уздоўж шырокай ракі мы едзем з бацькам Мінаем глыбей на беларускую тэрыторыю. Пад ясным і гарачым сонцам рака спакойна нясе свае хвалі ў далёкае Балтыцкае мора. Лес, выразны, як на гравюры, нерухома стаіць на тым беразе ракі. Бесперастанку страляюць мінамёты. Гэта чарговая расправа фашыстаў з безабаронным вясковым насельніцтвам. Раптам падняліся густыя слупы дыму і агню, запалала вёска. Якім недарэчным здаецца грукат мінамёта і гэтае вогнішча на фоне хараства, якое разгортваецца навакол. Толькі бесклапотнага салаўя не пужаюць ні стрэлы, ні

пажар. Ён высвіствае свае рулады на ўсе галасы.

Часамі мы з'язджаем з гасцінца на палявую дарогу, бо, паехаўшы наўпрост, можна і да немца ў госці трапіць. Недалёка ад дарогі стаяць, замаскіраваныя ў хмызняку, партызанскія танкі.

Па дарозе рухаецца шмат людзей: мужчын, жанчын, дзяцей. Безупынным патокам ідуць людзі прызыўнога ўзросту ў Чырвоную Армію. Ідуць, уцякаючы ад нямецкай навалы з гарадоў і вёсак, спаленых фашыстамі. Ідуць стомленыя, з клункамі, з дзецьмі. Моладзь і старыя ідуць у партызанскія атрады. Спачатку іх правяраюць у штабе, а потым ужо прымаюць у партызаны. Тут людзі розных прафесій: сяляне, настаўнікі, аграномы, дактары. Ідуць у партызаны цэлымі сем'ямі — бацька, маці, сын, дачка. Атрад — для ўсіх паратунак ад нямецкай навалы.

Сяляне—паважныя гаспадары, сялянкі—старыя знаёмыя бацькі Міная, рады сустрэчы з ім.

— Здароў, Мінай! — вітае яго старая прыяцелька.

— Здарова!

Па дарозе часта мільгаюць дзявочыя фігуры з цяжкімі вінтоўкамі: гэта сялянкі, студэнткі, настаўніцы.

У атрадзе Аляксея Г. партызаніць чатырнаццацігадовая Ганна М. Яна перажыла вялі-

кую трагедыю. Маці яе, як жонку партызана, застрэлілі немцы, сама дзяўчынка ледзьве ўратавалася ад смерці, брат героем загінуў у першым баю з фашыстамі. Цяпер Ганна засталася ўдваіх з бацькам-партызанам. Сэрца яе прагне помсты. Яна — партызанка і будзе помсціць і за разбураную школу, у якой яна вучылася, і за маці, і за брата.

Па дарозе мы сустракаем партызана Міхаіла Л. Сумны ідзе ён каля высокага воза. Мы ведаем Міхаіла Л. Ён адзін з удзельнікаў славутай аперацыі, у якой было знішчана 800 тон бензіну і 1016 тон хлеба. Міхаіл аддаў справе змагання ўсё, што мог. На возе ляжыць яго хворая жонка, якая ледзьве вырвалася ад немцаў з гарадка, у якім яе муж удзельнічаў у партызанскай аперацыі. Яна прынесла партызанам 6 бутэлек бензіну для падпалу складаў. Жанчына бегла лясамі і балотамі дзесяткі кілометраў, за ёй гналіся немцы. Але другое страшнае гора спасцігла Міхаіла Л. — 11-гадовая дачка Алеанора была схоплена немцамі і расстраляна. Цяпер Міхаіл Л. удвух з адзінаццацігадовым сынам Ігарам партызаніць.

Шырока, як рэчка, разлілося гора па беларускіх прасторах. Магутныя хвалі помсты ўздымаюцца на гэтай рэчцы. Народ жорстка плаціць нямецкім катам за пакуты сваіх родных і блізкіх, за гора нашай зямлі.

Большэвікі даюць напрамак гэтай народнай стыхіі, райком партыі кіруе дзейнасцю народных мсціўцаў. Сакратар райкома тав. Іван Б. асабіста ўдзельнічае ў многіх баявых аперацыях. Райком дапамагае сялянам, якія пацярпелі ад нямецкай навалачы: у каго няма хлеба—дапамагае хлебам, у каго спалена хата—дае прытулак у другой вёсцы. У час сяўбы райком забяспечваў сялян насеннем.

У адной з вёсак мы сустрэлі сакратара райкома Івана Б. на сялянскім сходзе. Тут ён праводзіць гутарку аб становішчы на фронце. Уважліва слухаюць сяляне прамову, задаюць самыя рознастайныя пытанні. Сакратар райкома падрабязна адказвае на ўсе пытанні. Гутарка зацягваецца на некалькі гадзін. Мы едзем далей.

У атрадзе Аляксея Г. нам паказваюць нядаўнія трафеі атрада — зброю, цудоўны акардыён і 2 маторныя лодкі, адбітыя ў немцаў. Майстры, якія адбілі лодку, запрашаюць нас праехаць па рацэ. Акардыён партызаны вырашаюць пасլаць беларускаму ансамблю чырвонаармейскай песні і пляскі, з той, аднак, умовай, што тыя прыедуць да іх у госці, альбо, у крайнім выпадку, сыграюць для іх па радыё любімыя песні: «У бой за радзіму, у бой за Сталіна», «Франтавую Кацюшу» і беларускую «Лявоніху».

У атрадзе ордэнаносца Данілы сёння гара-

чы дзень. Хлопцы наладзілі вялікі налёт на нямецкі гарнізон з тым, каб перабіць немцаў і адбіць 300 коней, якія прызначаны для нямецкай арміі. З паходу партызаны вяртаюцца змораныя, але задаволеныя. Каля 40 фашыстаў удалося знішчыць у разгромленым каравульным памяшканні. Нямецкія гарматы, якія былі ў вёсцы, не паспелі зрабіць ніводнага стрэлу, прыслуга была перабіта. І хоць з кулямётаў вораг вёў інтэнсіўны агонь, атрад вярнуўся без страт.

Камандзір атрада Даніла — аграном, ён вучыўся ў Горацкім сельскагаспадарчым інстытуце.

— Ваенным стратэгам ніколі не быў, — кажа ён, — а вось вайна навучыла. Ваюем і, здаецца, не кепска. Праўда, крыўдзяцца на мяне хлопцы — залішне блізка да ворага я камандны пункт выношу ў час бою. Кажуць, што вельмі даўгі я, мішэнь вялікая.

Сапраўды, Даніла, які стаіць тут паміж сваіх хлопцаў-партызан, у карычневым, вайсковага крою касцюме, на некалькі галоў вышэйшы за сваіх таварышаў.

— Вось і ўчора, — кажуць партызаны, — вылез наш камандзір у самае пекла бою, проста ніяк не стрымаеш яго.

Даніла — камандзір дзейны і энергічны. Ён не чакае ворага, а безупынна шукае сустрэчы з ім. Да таго-ж ён добры гаспадар. У яго ат-

радзе цудоўны хлебазавод, які забяспечвае хлебам многія атрады і часці Чырвонай Арміі. Заўсёды ў Данілы знойдзецца свежая рыба: ён арганізаваў рыбакоў у арцель, і яны даюць атраду колькі трэба рыбы.

З сапраўдным гумарам апавядае Даніла аб тым, як ён выконваў аднойчы ролю бургамістра, захапіўшы нямецкія склады са збожжам і бульбай.

На склад прыехала шмат фурманак і з імі два паліцэйскія.

— Нагружайце, паны паліцэйскія, — сказаў Даніла. — Але глядзіце, — звярнуўся ён да сваіх памочнікаў-партызан, — каб усе накладныя былі акуратна аформлены.

— Ды ў парадку будзе, пан бургамістр! — адказваюць яму партызаны і ледзь не пырскаюць ад смеху. Калі ўсё было нагружана, Даніла сказаў:

— Паны паліцэйскія, выйшла памылка! На ваш вялікі жаль, я не пан бургамістр, а партызан Даніла. Прашу вас спакайней, паны... Цяпер вы паедзеце разам з маімі хлопцамі і здасце ўсё гэта Чырвонай Арміі. Рэшту бульбы і збожжа раздаць сялянам.

Паліцэйскія ўнылі. Затое сяляне-падводчыкі закрычалі «ура» і сказалі:

— Павязем Чырвонай Арміі збожжа. Хочам пабачыць нашых вызваліцеляў.

— Так мы разыгралі нямецкіх прыхвасняў,— канчае Даніла свой расказ.

У атрадзе Данілы шмат герояў, многія з іх узнагароджаны ордэнамі Саюза ССР. Стары, пяцідзесяцігадовы партызан Андрэй Максімавіч П. і 16-гадовы Федзя К. з аднолькавым энтузіязмам змагаюцца супроць фашыстаў. Федзя сам абвясціў сябе камандзірам падраздзялення ў часе бою. З 9 чалавекамі ён зайшоў ворагу ў тыл і бліскуча выканаў аперацыю. Федзя — умелы і хітры разведчык. І ён, і Андрэй Максімавіч узнагароджаны за храбрасць у баю медалямі СССР.

У атрадзе Данілы змагаўся бясстрашны партызан, Герой Совецкага Саюза Міхаіл Сільніцкі.

Вось сядзяць яго баявыя таварышы, якія разам з ім удзельнічалі ў славутым баю. Недалёка, каля кузні, стаіць яго хаціна — тут жыве бацька, маці, сястра Таня, малы брат Коля.

— Адважны быў Міша! Аднойчы яго паслалі ў разведку выведаць сілы немцаў, а ён зайшоў з могілак з кулямётам і адзін выгнаў 38 разбойнікаў з вёскі. Пакуль падышлі партызаны, аперацыя была закончана.

— Як цяпер ён стаіць перад маімі вачыма, — кажа другі партызан,— стройны, у сінім камбінезоне. У арміі ён быў танкістам. Аднойчы яму прыгразіў бургомістр воласці:

— Глядзі, Сільніцкі, каб ты не трапіў на шыбеніцу, нешта ты ўсё глядзіш у совецкі бок.

— А ты, нямецкая вош, маўчы, бо я танкам яшчэ развярну тваю хату. А пікнеш дзе, — Міша схапіў збялелага бургоміcтра за горла, — дык мне не штука кончыць цябе ў момант.

Бургомістр з таго часу баяўся слова сказаць. Адно, апасліва азіраючыся, каб ніхто не чуў, бурчэў:

— Гэты Мішка — проста вар'ят!

У памятным баю, у вёсцы П., калі Сільніцкі скасіў 50 фашыстаў і, з-за нястачы патронаў, выйшаў з засады, ён не гнуўся пад нямецкім агнём, а ішоў на ўвесь рост і, нават, прыгразіў кулаком фашыстам:

— Ці мала я вас, падлюг, сёння пакасіў! — крыкнуў ён ім і акрываўлены ўпаў на зямлю. Але і паранены Міша яшчэ адстрэльваўся, а калі не мог ужо страляць — біў немца кінжалам. Ён знішчаў іх, пакуль сэрца не перастала біцца.

## ПЕСНЯ

Мы ўжо не першы дзень у партызанскіх атрадах, а вартавыя ўсё яшчэ ставяцца да нас недаверліва, як да чужых. Але такога сібернага пастаўога, як у атрадзе Міхаіла Фёдаравіча Б., нам яшчэ бачыць не даводзілася. Яму

усяго гадоў 12, і дужа ён падобны да Гаўроша, якім яго малююць у кніжках. Ніякія важныя пасведчанні не дапамагаюць. Ён цвердзіць адно:

— Пропуск!

— Але прапусці ты нас да каравульнага начальніка ці камандзіра атрада!—просім мы.

— Не падыходзь, а то буду ўжываць зброю! — І ён грозна наступае на нас з вінтоўкай.

Даводзіцца чакаць, пакуль з другога канца вёскі прыдзе начальнік каравула. Тады Якаў Р. крыху памякчэў.

— Можа ў школе вучышся?—пытаю яго.

— Якія могуць быць тут школы! — саркастычна ўсміхнуўся ён.—Тут-жа побач немцы!

На другім канцы сяла мы сустрэлі не менш markgroznaga паставога ў чырвонай хусцінцы — Марыю Ш. Яна ў свой час была настаўніцай той школы, дзе не так даўно вучыўся Якаў.

Раніцой Міхаіл Фёдаравіч сабраў нараду камандзіраў падраздзяленняў. Партызаны ўваходзілі і казыралі.

— Таварыш камандзір атрада, па вашаму загаду камандзір такі-та з'явіўся!

— Сядайце!

Гутарка ідзе аб новых аперацыях, аб тым, каб не даць немцу ні каліва збожжа.

Я ўглядаюся ў твары людзей. Вось гэты нізенькі, хударлявы хлапчына—адзін з лепшых

разведчыкаў атрада. Георгі Ю., спакойны, ураўнаважаны, у шырачэзным галіфэ і нямецкага крою фрэнчыку, курыць старамодную, вялізную люльку з накрыўкай. Усё гэта—трафеі, здабытыя пры разгроме валаснай управы.

У атрадзе ёсць цэлы стус белых паліцэйскіх нарукаўных адзнак з выразным надпісам «Ordnungdienst» (што азначае «служба парадку»). Ёсць пячатка валаснай управы.

На брахлівых фашысцкіх лістоўках, якія расклеены ў вёсках і гарадах, партызаны ставяць свае надпісы. На адной з такіх лістовак яны напісалі: «Яўная гітлераўская брахня». На плакаце да тэксту «Гітлер вызваліцель» яны прыпісалі: «Вызваліў ад ежы і адзежы». У мястэчку Ч. у дзень першага мая партызаны вывесілі чырвоны сцяг. Бургамістр сам палез здымаць яго, але як толькі дакрануўся да дрэўка сцягу, узляцеў у паветра. Аказваецца там, дзе быў вывешаны сцяг, партызаны залажылі дзве міны. Назаўтра з'явіўся лаканічны надпіс партызан: «Не чапай совецкага сцягу».

Партызаны люта ненавідзяць здраднікаў — нямецкіх прыслужнікаў. У іх рукі самі сціскаюцца ў кулакі, калі ім успамінаеш аб гэтых вырадках.

У адным з атрадаў мне давялося гаварыць з такім вырадкам, захопленым партызанамі.

Гэта былы поп. У 1926 годзе ён праз газету абвясціў, што выракаецца веры і становіцца настаўнікам. Агідна глядзець на гэтае нікчэмнае падабенства да чалавека. Не верыў ён у бога, калі быў папом, не быў атэістам, калі выракаўся рэлігіі, не верыў у тое, чаму вучыў дзяцей.

— Ці чуў ён аб тым, што найбольш сумленныя прадстаўнікі праваслаўнай царквы люта ненавідзяць фашыстаў і выступаюць супроць іх, што некаторыя з іх з'яўляюцца партызанамі і знішчаюць немцаў?

— Чуў,—нехаця адказвае ён.

Але што яму да таго. Яму фашысты добра плацілі, і ён служыў ім.

Прадажная шкура! Немцы выкарыстоўвалі яго на самую брудную і агідную работу.

Позна ўначы, за 10 кілометраў ад вялікага беларускага горада, які цяпер быў асветлены зарніцамі артылерыйскіх выбухаў, думалася аб велічы і нізасці чалавечага існавання. Поп, які так лёгка выракся сваёй веры, а потым згодны быў служыць усякаму, хто больш заплаціць, — жыў нізкім жывёльным жыццём і загіне, як жывёліна.

У атрадзе Міхаіла Фёдаравіча Б. я пачуў гісторыю жыцця і смерці бясстрашнага патрыёта радзімы партызана Колі Азевуша. Ён быў малады, прыгожы, толькі што скончыў сярэд-

нюю школу. Наперадзе ў яго было ўсё жыццё. Але калі патрэбна было, ён аддаў сваё маладое жыццё за радзіму, за народ. Ён з трыма таварышамі змагаўся супроць 70-ці немцаў і загінуў як герой. Коля пагарджаў небяспекай. Калі яму напаміналі аб ёй, ён гаварыў: «Я браніраваны».

Аб гэтым і казкі раскажуць і песні спяюць. І пяюць ужо. Стары, 60-гадовы настаўнік тутэйшай школы, які ніколі раней вершаў не пісаў, быў так узрушаны подвігам героя, што напісаў аб ім верш. Партызаны прыдумалі матыў, і ўжо жыве песня пра Колю Азевуша.

## «НЕ ЛЕЗЬЦЕ Ў НАШ ПАРТЫЗАНСКІ КРАЙ»

У штабе бацькі Міная наступілі трывожныя дні. Бесперастанку званіў тэлефон, з'яўляліся і хутка выпраўляліся ў дарогу пасыльныя. Бацька Мінай, начальнік штаба і камісар безупынна выязджалі то ў той, то ў другі атрад. Насоўваліся важныя падзеі.

Адусюль разведка даносіла аб канцэнтрацыі супроць пазіцый, занятых партызанамі, значных нямецкіх сіл, з танкамі, гарматамі і мінамётамі.

І вось аднойчы раніцой у штабе трывожна

зазвінеў тэлефон. Усхваляваны голас з далёкага атрада крыкнуў у трубку:

— Пачалося!

Больш ён нічога не паспеў сказаць, і надалей сувязь з атрадам абарвалася.

Штаб і ўсе астатнія атрады былі прыведзены ў баявую гатоўнасць. Партызаны занялі загадзя нарыхтаваныя для абароны дзоты.

Так пачаўся шырока рэкламіраваны фашыстамі «Тыдзень па знішчэнню партызан».

Спачатку немцы кінулі супроць партызан аднаго атрада да 2 батальёнаў пяхоты, пры падтрымцы 3 танкаў, артылерыі і цяжкіх мінамётаў.

Не гледзячы на перавагу сіл ворага, партызаны прынялі бой і нанеслі гітлераўцам значныя страты.

Не дабіўшыся поспехаў на гэтым напрамку, немцы кінулі роту матарызаванай пяхоты з боку горада. У гэты самы час 200 фашыстаў павялі наступленне на атрад Аляксея Г. Яшчэ адна буйная група фашыстаў у колькасці да 500 салдат пачала абстрэл штаба атрада, ума цаванняў і пайшла на партызан з боку вёскі Д

Партызаны грудзьмі сустрэлі ворага і лоба вой атакай пачалі яго адбіваць. Адзін за ад ным з'яўляліся забітыя і параненыя ў нашы радах. Вёску К. вораг акружыў з трох бако

Партызаны, якія былі там, падпускалі фашыстаў на 50 метраў і білі на смерць. Але немцам, цаной вялікіх ахвяр, удалося ўварвацца ў вёску. Партызаны адступілі. Фашысты пачалі расправу з сялянамі. Яны расстрэльвалі, кідалі ў агонь старых і дзяцей. У агні загінула 103-гадовая беларуская жанчына Аўгіння Міганенка. Немцы шалелі і лютавалі, яны «вынішчалі партызан».

Бацька Мінай, які быў на полі бою сярод партызан, з кожнай гадзінай гэтай беспрыкладнай барацьбы ўсё больш і больш хмурнеў.

— Не так, не так!—казаў ён пацІху сабе.

Надвечар бой прыціх.

На ўзлеску сабраў бацька Мінай свой штаб і сказаў:

— Добра біліся хлопцы, мужна! Хвала ім! Героі! І тыя чатырнаццаць, што загінулі, недарма пралілі сваю кроў. Вечная і добрая памяць ім. Але не так трэба. Мы не вайсковая часць. Мы—партызаны... Загад просты— біць немца не ў лоб, а ў патыліцу. У нас такіх страт больш не павінна быць. Трэба пакінуць вёскі. Насельніцтва ратаваць. Папярэдзіць, каб ішлі ў лес з сем'ямі і дзецьмі.

Яшчэ 6 дзён ішла барацьба партызан бацькі Мінаяз рэгулярным нямецкім войскам, агульная колькасць якога перавышала 6 тысяч салдат, і партызаны перамаглі.

У асобныя дні на партызан ішлі ў наступ цэлыя нямецкія палкі з 10—12 танкамі, але партызанам вялікай шкоды не прыносілі. На атрады Міхаіла Фёдаравіча і Данілы Р. ішло ў наступ да 3 тысяч гітлераўцаў. Партызаны адбілі ўсе атакі.

Немцы вымушаны былі падцягнуць свежыя рэзервы, і баі разгарэліся з новай сілай. У многіх месцах партызаны пераходзілі ў штыкавыя атакі.

Адзін партызан-кулямётчык быў акружаны вялікай групай фашыстаў. Але ён не здаўся. Пад градам куль, прывязаўшы кулямёт да нагі, ён выпаўз з акружэння і, заняўшы новую пазіцыю, адкрыў па немцах знішчальны агонь. Другі кулямётчык пралез у самае логава немцаў, пачаў іх расстрэльваць з кулямёта і выратаваў такім чынам 13 акружаных таварышаў. Партызан, які ў баю страціў зброю, выхапіў у немца ручны кулямёт і расстрэльваў ім фашыстаў. У момант, калі атраду параненага ў баю Аляксея Г. пагражала смяротная небяспека, на выручку кінуўся камандзір суседняга атрада Рыгор Курмялёў. Ён з групай партызан-аўтаматчыкаў ускочыў на танк, уварваўся ў асяроддзе немцаў і рассеяў іх.

Тактыка змагання ў партызан цяпер была іншая.

Немцаў прапускалі наперад, а потым пачыналі біць з флангаў і тылу. Іх сустракалі не-

чаканыя засады. Яны баяліся крок ступіць наперад, бо не ведалі адкуль чакаць удару. А ён іх чакаў з-за кожнай купіны, дрэва, насыпу, яміны.

Страты партызан цяпер былі малыя.

Фашысты пачалі знясільвацца і, пад ударамі партызан, пакаціліся назад.

Так ганебна праваліўся нямецкі «тыдзень па вынішчэнню партызан».

Немцы былі злосныя. Там, у партызанскім краі, яны пакінулі забітымі 450 салдат і афіцэраў, 10 аўтамашын з жывой сілай, 3 танкі і шмат коней. Сярод партызан было 14 забітых і 23 параненых.

Пры адступленні немцы лютавалі над мірным насельніцтвам. Яны спалілі 50 вёсак. 2500 сялянскіх двароў перасталі існаваць. Партызаны пачалі займаць пазіцыі каля асобных вёсак, імкнучыся ўратаваць іх ад немца. Многія паселішчы, абароненыя партызанамі, уцалелі. За асобныя вёскі, якія фашысты хацелі спаліць, узнікалі жорсткія баі. Невялікая група партызан з атрада Аляксея Г. суткі абараняла паселішча, не даючы яго знішчыць фашыстам. Некаторыя партызаны заплацілі сваёй крывёй, але вёску не здалі. На папялішчы спаленых будынкаў можна знайсці ашматкі нямецкіх шынялёў, касак, пабітыя мінамёты. Гэта сляды нядаўніх баёў.

У гэтых баях немцы выявілі сябе не як моцныя ваякі, а як жорсткія каты.

Трагедыя 2.500 спаленых сялянскіх двароў ніколі не забудзецца!

## «ПАН УПРАЎЛЯЮЧЫ»

З партызанам Якавам мы ідзем у атрад Міхаіла Іванавіча Д. Па дарозе сустракаем падводу. На ёй чалавек—загарэлы, з суровым абветраным тварам. Не гледзячы на спякоту, ён апрануты ў баранковую целагрэйку.

— Гэта і ёсць Міхаіл Іванавіч, — кажа мне Якаў.

— Вітаю вас з ордэнам Леніна! — гавару я Міхаілу Іванавічу.

— А што, дзе напісана аб гэтым? А я і не ведаў! Кепска да нас газеты прыходзяць. За ўзнагароду аддзякуем партыі і ўраду. Немцы гэта на сваёй шкуры адчуюць. Бацька Мінай паказаў ім ужо, як лезці ў партызанскі край! Хутка і я пакажу!

Вёска. Пасты. Патрабуюць пропуск. Праз некалькі хвілін мы сядзім у коле партызан і вядзем вясёлую гутарку. Аказваецца, ёсць тут мае знаёмыя: выкладчыкі мовы і літаратуры, сустрэў настаўніка — брата беларускай актрысы. Сам ён таксама вялікі штукар. У атрадзе яго ўсе любяць і ласкава завуць: «Наш Сенечка».

Паступова гутарка пераходзіць на тое, як арганізаваўся атрад, як людзі прыходзілі ў партызаны. Смешныя эпізоды перамешваюцца з трагічнымі, і мы не заўважаем, як надыходзіць ноч.

Былі цяжкія дні ў жыцці партызан. І вось вестка аб набліжэнні часцей Чырвонай Арміі да Беларусі ўскалыхнула ўсё навокал, узняла ўвесь народ.

Я бачу, як партызанскі камандзір Міхаіл Іванавіч, даведаўшыся аб набліжэнні Чырвонай Арміі, зрываецца з пасцелі без зброі і мчыць у дом нямецкага упраўляючага, які п'яным ляжыць на печы. Міхаіл Іванавіч тармошыць яго, крычыць:

— Пан упраўляючы, злазь!

— Адчапіся, я абедаю!—прамармытаў той праз сон.

— Зброя твая дзе?—грозна запытаў Міхаіл Іванавіч, сцягваючы ўпраўляючага з печы.

Той ачухаўся крыху, пакорна паплёўся ў кут і падаў вінтоўку.

— А ну, вядзі да тваіх паліцэйскіх!

Паліцэйскі аказаўся больш натурлівым.

— Здай сваю вінтоўку!—прапанаваў Міхаіл Іванавіч.

— А ты мне яе даваў?

— Я не люблю дыскусій!—адказаў Міхаіл Іванавіч і ляснуў затворам.

— У каморы вінтоўка. Бяры, каб цябе халера ўзяла!—ляніва сказаў паліцэйскі.

— Запрагай каня, паедзеш са мной!—загадаў Міхаіл Іванавіч.

— Так за адну ноч я аб'ездзіў шмат вёсак і здабыў нямала зброі,—кажа камандзір партызан.—Толькі калі я трапіў у вёску Г., я сустрэўся з дзіўным паліцэйскім.

— Давай тваю вінтоўку, пан паліцэйскі!

— Я такі-ж пан, як і ты!—задзірліва адказаў той.

— Ну, без жартаў!

— А я і не жартую. Ты думаеш, калі партызаны мяне паставілі за паліцэйскага, дык ты вельмі камандаваць будзеш мною. А згары яно з такой службай!

— А хто-ж ты такі?

— А я Сівер С.! Не чуў?

— Чуў!

— От, бачыш!

— Ну, то пойдзем, братка, са мной, паможаш мне зброю збіраць.

Раз гутарка зайшла пра Сівера С., партызаны ўспамінаюць яго таварыша і паплечніка па баявых дзеяннях — Фаму У.

— Няхай Фама раскажа, як ён быў «панам упраўляючым», — просіць нехта з партызан, паказваючы на сарамлівага, спакойнага хлапца, які сядзеў непадалёку.

— Ат, што там расказваць! — аднекваецца Фама.

— Ну, то я раскажу! — абзываецца бойкі, высокі з хітрымі вачыма Казімір С., былы дырэктар сярэдняй школы.

— Быў у нас Фама, — пачынае Казімір, — старшынёй калгаса. Вельмі гаспадарка ў яго добра была наладжана. Народ ім задаволены, абавязкі перад савецкай дзяржавай у тэрмін выконваў. Прысталі да яго немцы, каб ён і надалей быў за старшыню, па іхняму «панам упраўляючым грамадскага двара». Вельмі ўпадабалася ім тое, што ён абавязкі перад дзяржавай у тэрмін выконваў. Фама да партызан: «Які я к чорту пан упраўляючы... Яшчэ віламі жывот прапару пану бургамістру». А партызаны яму: «Будзь ты нашым, партызанскім панам упраўляючым. Нічога, кажуць, брат Фама, ты патрапіш, як абыходзіцца з немцамі». Ну, і завёў-жа Фама парадкі! У валасную ўправу за старшыню паставілі Уладзіміра С., мяне за сакратара ўзялі. Нават свайго партызанскага паліцэйскага прызначылі—Сівера С. І пайшла ў нас работа. Устанавілі мы радыё ў валаснои управе. Кожны дзень зводкі Савецкага інформбюро слухаем і партызанам перадаем. Даведкі яўрэям пішам, што яны сапраўдныя хрысціяне. Фама так заганарыўся, што ўжо гаварыў: «Якія там абавязкі ў мяне могуць быць перад нямецкай дзяржавай. Ды што гэта за дзяр-

жава—цьфу!» Нарыхтовак не здае, а ўсё піша акты, што здаваць няма чаго, нямецкая армія разрабавала. Яно такі гэтак і было: усё, што не паспелі схаваць, забралі немцы. Але што-ні-што было прыхована. Жыта ў нас было пасеяна 96 гектараў, а ён піша 46, ды і тое падратована немцамі. Азімых пасеваў, замест 57 гектараў, піша 17 гектараў, ды яшчэ 17 сотак выдумаў. «Без сотак, — кажа, — быць не можа!» Здаў нейкую кроплю жыта і — баста! За тое вельмі ўхапіўся за выкананне лесанарыхтовак: выслаўшы адну хурманку, за адзін дзень выканаў гэтыя нарыхтоўкі. Так сказаць, датэрмінова. Падпаіў аб'езчыка, дык той і пасведчыў. А потым гэты шаленец Фама так разышоўся, што ўварваўся аднойчы з вінтоўкай у калону немцаў, пастраляў іх, ды і знік. Праўда, пра гэта немцы не даведаліся. Але бачаць, ліха ведама што робіцца ў гэтага Фамы. Яўрэяў хавае ў сябе дома, паставак не здае. Прыязджае паліцэйскае начальства—Лабкоўскі і Шабанаў на расправу з намі, застрэліць парашылі Фаму. Ну, дык мы зрабілі наадварот. Іх пастралялі, а самі ў партызаны. Перад расстрэлам, каб паліцэйскія не здагадаліся, што ім рыхтуецца, я яшчэ запрасіў іх да сябе на абед. «Калі ласка, паны паліцэйскія, я толькі што ажаніўся, да мяне на абед». А тым часам хлопцы рыхтавалі ім месца апошняга спачывання. Пасля гэтага

сабраліся мы ўсе,—я і жонку з сабой забраў,— і падаліся ў атрад.

— Няхай-жа Казімір раскажа, як ён 15 фрыцаў забіў,—не ўнімаўся ўсё той-жа голас.

— Гэта ўжо зусім не цікава!—адказаў Казімір С.

— Ах, весела ён іх трушчыць!— з націскам на слове «трушчыць» азваўся той-жа партызан. Усё з насмешкай, ды са словам вясёлым. Як заб'е аднаго, гукне: «Ах, ты хрыц праклятый, ах, ты нячысцік вашывы! Яшчэ аднаго гера-арыйца адправілі на той свет»!—крычыць ён. Хоць немцы нас і здорава палівалі кулямі, але весялей рабілася на душы ад гэтых слоў. 15 фрыцаў, як лёду, ён тады палажыў... Вось табе і дырэктар школы!

— От, Толя Кірылаў — вось гэта дык хлопец быў!—з сумам сказаў Казімір. —Жыў як герой і загінуў як герой. Тут бацька яго ў атрадзе і маці і сястра. У іх уся сям'я партызанская.

Як волат з быліны, уздымаецца 19-гадовы светлавалосы юнак Анатоль Кірылаў.

## АНАТОЛЬ КІРЫЛАЎ

У лесе змяркаецца. Даўгія цені дрэў кладуцца на вільготную зямлю. Анатолю так хораша і прыемна пасля вялікай стомы адпачы-

ваць на яловых лапках, адчуваць пах смалы і прэлай зямлі.

На белых бярозах чырванеюць свежыя раны, з іх струменіць сок. Калі Анатоль толькі вярнуўся ў лес, яму здавалася, што ён вып'е ўвесь сок з бяроз—да таго яго мучыла смага. А цяпер ён ужо здаволіўся і адчуваў, што пачынае засынаць.

Сёння быў цяжкі баявы дзень. У тры гадзіны ночы ўдарылі партызаны па нямецкаму гарнізону ў адной вёсцы. Пачуліся перапалоханыя галасы немцаў, страляніна з усіх бакоў. Анатоль нічога не хацеў бачыць і чуць. Ён насцярожана прыглядаўся да кожнай варожай фігуры. Ён чакаў моманту, калі пасля яго стрэлу даўгалыгі немец, нязграбна ўзмахнуўшы рукамі, ткнецца носам у мяккую раллю.

— Ага! Ёсць! Упаў! Як ён дзіка зароў. Голас піскілвы, страшны.

Гэты голас толькі гарачыў Анатоля. Яму хацелася кінуцца на ўсю гэту зграю, якая хавалася за свірнамі і хатамі, і бязлітасна душыць іх, калоць, страляць. Не таму, што ён любіў кроў. Наадварот, яму непрыемна было на яе глядзець, але немцы былі для яго чымсьці больш агідным за шкадлівага аблезлага сабаку, які непрыкметна падкрадаецца да цябе, а потым хутчэй уцякае ў вароты. Яго

хочацца забіць, біць і таптаць, колькі-б ён не скуголіў і не якатаў.

І калі камандзір загадаў: «у атаку!»—Анатоль першы ўстаў і кінуўся ўслед за ім. Падняўся ўвесь партызанскі ланцуг. Мора агню бушавала над вёскай. Шыпелі і высвіствалі міны, коратка і нервова білі аўтаматы.

Партызаны выбілі немцаў з вёскі. Анатолю прыемна было бачыць, як палаюць два страшыдлы — нямецкія танкі.

Побач з Анатолем, ляжаць яго таварышы-партызаны. Кожны з іх заняты сваімі думкамі. Анатолю прыйшлі на памяць падзеі гэтых апошніх месяцаў.

Да іх у вёску немцы ўвайшлі параўнальна спакойна. Спакойна яны выграбалі з свірноў хлеб, забіралі свіней і жывёлу.

Пачалі яны шалець, калі загаварылі аб камуністах і советах. Схапілі 11 невінаватых людзей і павесілі. У двух жанчын засталіся сіратамі маленькія дзеці: дзесяці і чатырох гадоў. Маці Анатоля часта карміла іх дома, плакала і суцяшала. Анатолю цяжка было ўсё гэта бачыць, нешта душыла яму горла. У гэткія моманты ён ішоў за вёску, у лясок, узлазіў на слуп і тапорыкам перасякаў провад. У адным месцы, у другім, у трэцім. Тады яму рабілася лягчэй на душы, і ён, схаваўшы пад кашулю тапорык, задаволена пасвістваючы, ішоў дахаты.

Два радкі яму прыемна было паўтараць у такія моманты:

«Душой я вольны чалавек.
І гэткім буду цэлы век!»

Потым немцы яшчэ больш візгліва пачалі лементаваць:

— Партызан! Партызан!.. — І пачалі паліць вёску.

Тады Анатоль з бацькам пайшлі ў партызаны. Маці і сястры Мані яны сказалі, каб сцерагліся: як толькі справа будзе кепская, няхай прыходзяць у атрад.

Назаўтра Анатолю была даручана сур'ёзная задача. Яму, як аднаму з самых адукаваных людзей, трэба было прабрацца ў вёску і правесці гутарку з сялянамі аб айчыннай вайне. Даўно ўжо сяляне прасілі прыслаць чалавека, які-б мог па шчырасці пагутарыць з імі.

Анатоль паважна растлумачваў барадатым сялянам сэнс падзей. На кулямётныя ленты, якімі ён быў падперазаны, з зайздрасцю пазіралі хлапчукі.

— Вось гэтак сама, — думаў Анатоль,—ён нядаўна яшчэ сам пазіраў на партызан.

Калі Анатоль загаварыў аб выпуску ваеннай пазыкі, павольны стары селянін спакойна заўважыў:

— Дык і мы-ж чым-ні-чым маглі-б дапамагчы. І наша капейка не будзе лішняя, абы хутчэй канец гэтаму антыхрысту Гітлеру.

Усе дружна падтрымалі старога. Пайшлі дахаты, прынеслі хто грошы, хто аблігацыі.

З вёскі Анатоль выбраўся пасля паўдня. Думаў яшчэ заскочыць праведаць матку. За вёскай ён заўважыў, што яму насустрач рухаецца чалавек шэсцьдзесят узброеных немцаў. Вяртацца назад Толя палічыў нязручным—яшчэ падумаюць, што ён спалохаўся. У лес звярнуць—далёка.

Анатоль выбраў ладны камень за ўзгоркам і прытаіўся за ім. А немцы ўжо заўважылі яго зброю і пачалі займаць пазіцыі за свірнамі і дамамі бліжняга пасёлку.

Анатоль вырашыў не выпускаць ініцыятывы з сваіх рук і першы адкрыў агонь з карабіна.

— Мала, што іх шмат,—думаў ён,—тут яны мяне не возьмуць. Патронаў на ўсіх хопіць! Яны не прыступяцца да гэтага ўзгорку!

Ён яшчэ шчыльней прыпаў шчакой да вінтоўкі і пачаў цэліцца ў афіцэра. Трэба апярэдзіць яго і стрэліць раней. Анатоль яшчэ не паспеў пачуць гуку свайго стрэлу, як афіцэр нязграбна прысеў на дол.

Наступіла хвіліна перапынку. Немец жаласліва крычаў:

— Рус, здайся!

Паліцэйскі прахвост гукнуў:

— Толя, ты-ж мяне ведаеш, не будзем цябе чапаць, ідзі закуры.

Тады Анатоль устрапянуўся. Гэтыя словы

больш балюча чым кулі ўдарылі яму ў сэрца. Так агідна яму было слухаць словы здрадніка. Толя прышчураным вокам нацэліўся яму ў грудзі, і той паляцеў потырч.

— Страляйт! — зароў немец, і пачалася страшная страляніна.

Анатоль толькі праз некалькі хвілін заўважыў, што з нагі ў яго цячэ кроў. Адной рукой ён цэліўся, другой дастаў хустачку і прылажыў яе да раны.

Некалькі разоў немцы і паліцэйскія ішлі на Анатоля ў атаку, імкнуліся акружыць яго, але, пакінуўшы забітага або параненага, вярталіся за будыніны.

Тры разы Анатоль мяняў пазіцыю. Ён быў яшчэ раз паранены ў бок.

Раз'юшаны паліцэйскі крычаў:

— Ты за каго ваюеш?

Анатоль адказаў, перамагаючы боль:

— Я ваюю за Сталіна, за радзіму! А вы, прадажныя шкуры, прадаеце народ нямецкай сволачы.

І хоць боль ад ран быў неймаверны, яму пры-емна было гаварыць аб радзіме, лежачы на мо-край, веснавой, палітай сялянскім потам зямл

І гэта была, здаецца, апошняя яго свядома думка. Ізноў узняліся на яго ў атаку немц ён пачаў ужо слабеючымі рукамі яшчэ леп цэліцца, зваліў двух гадаў і, прабіты куля навекі змоўк.

# РАСКАЗ МАЦІ

Марфа Ільінічна Кірылава — простая беларуская жанчына. Ёй, як і ўсякаму сумленнаму чалавеку, ненавісны немцы. Яна ненавідзіць іх як чужынцаў, якія прыйшлі паганіць нашу зямлю, забіваць нашых людзей. Як толькі немцы прыйшлі ў іх пасёлак, яны павесілі адзінаццаць чалавек. Усё гэта невінаватыя людзі. На каго толькі меў злосць кулак, подлы вырадак Каразееў—усіх ён упісаў у гэты спіс. Так загінуў рабочы Буланаў. Апошнія яго словы былі напісаны на сцяне турмы: «Перадайце маёй жонцы, што Уладзімір Іванавіч Буланаў загінуў ад нямецкіх акупантаў».

Караткевіч Іван, Забалотнік, Талсцякоў, Плескуноў, Дзямкоў былі павешаны на плошчы ў мястэчку. Павесілі фельчара Елізавету Говар і кухарку Марыю Новікаву. У іх засталіся бяздомнымі сіратамі маленькія дзеці.

— Цяжка было на ўсё гэта глядзець,—кажа Марфа Ільінічна. —Бывала, ідзе па вёсцы пераапрануты чалавек. Разумееш—свой, партызан. У хату пускаць нельга, сочаць паліцэйскія. Міргнеш: «Пачакай, чалавеча, за вёскай!» А сама апошняе збярэш, пакладзеш у кошык і пашлеш з Маняй. Сірату накорміш... А ўсё наш бургомістр коса глядзіць. Потым немец пачаў вёскі паліць. Тады ўсе мужчыны

пайшлі ў партызаны. Пайшлі і нашы: бацька і Толя. Мы з Маняй засталіся дома.

— Аднойчы прыбягаюць да нас людзі і кажуць: «Немцы ідуць партызан лавіць».

— Я з Маняй пабегла папярэдзіць партызан. Ісці было цяжка—кругом глыбокія снягі. Закруціліся мы з Маняй у адну хусціну і ніяк не можам сагрэцца. А тут немец заўважыў нас і пачаў страляць з аўтамата. Мы доўга ляжалі на снезе, а потым ледзьве дапаўзлі да нашых.

— Больш вяртацца дадому ўжо нельга было. Начавалі мы ў вёсках, дзе нас мала ведалі. Аднойчы ў чужой хаце нас заспеў немец. Прыйшоў, крычыць: «Ваш партызан зрабіў нам бум, бум, а мы зробім шах!»—і чыркае запалкай аб карабок.

— Выскачылі мы з хаты, калі яна была ўжо ахоплена густым дымам, балазе блізка лес быў, дык мы туды і кінуліся.

Марфа Ільінічна хвіліну маўчыць. Яшчэ малады твар гэтай 43-гадовай жанчыны хмурнее, і яна пачынае расказваць далей:

— Гэта было 21 красавіка. Мне сказалі, што Толя раніцой паехаў з партызанамі ў суседнюю вёску. Пад вечар чуем страляніну. Думаем, пэўна партызаны немца трывожаць. Так і не здагадалася я тае начы пра ліха.

У Марфы Ільінічны па твары цякуць слёзы.

— Толькі назаўтра бачу мой стрыечны брат

пайшоў з посцілкай за вёску. Я не здагадалася—чаго. Потым ён прыходзіць і кажа: «Ваш Толя паранены ў мяне ляжыць». Я кінулася туды. Аж сын мой ляжыць мёртвы. Немцы-каты здзекваліся з яго: ужо забіўшы, яны стралялі ў галаву разрыўнымі кулямі.

— 23 красавіка партызаны і байцы нашай разведкі хавалі Толю. Цяжка мне было аддаваць зямлі адзінага сына, але ён загінуў не дарма. Адзін змагаўся супроць шасцідзесяці фашыстаў і шмат іх палажыў. Анатоля знайшлі з моцна сціснутай у руках вінтоўкай і прышчураным вокам. Ён цэліўся ў сваіх смяротных ворагаў. Так яго і пахавалі ў постаці байца.

— Калі цела Толі апускалі ў зямлю, я праз вялікае гора, якое душыла мне грудзі, чула словы партызан і воінаў: «Мы адпомсцім за смерць партызана-героя!».

— І яны адпомсцілі. Неўзабаве 500 нямецкіх фашыстаў было знішчана партызанамі і разведчыкамі-байцамі. Гэта была помста за смерць Анатоля.

— Пры совецкай уладзе мае дзеці сталі адукаванымі людзьмі. Маня вучылася ў медыцынскім тэхнікуме, Толя скончыў 8 класаў і горную школу. Вельмі любіў кніжкі чытаць. Мяне слухаў. Ён яшчэ змалку курыць увык. Бывала я скажу: «А ну, Толя, ты зноў сёння курыў, хукні мне». Ён кажа: «Не трэба і

хукаць—курыў, мамачка, але больш не буду». І спраўдзіць слова. Ён яшчэ як партызанам не быў—парваў нямецкія правады, сапсаваў тэлефон. Усё казаў: «Не я буду, калі не прыкончу з поўсотні немцаў!» —Правільна, сынок! Трэба іх канчаць, гэтых чужынцаў. Яны, бач, гандлююць нашай зямлёй. Абвясцілі: «Хто партызана зловіць — таму дадуць 5 гектараў зямлі, хто заб'е — адзін гектар». Знайшліся злыдні—гаспадары на нашу зямлю.

— Над магілай майго сына зацвілі кветкі, а я ціхом, каб ніхто не бачыў, паплачу, і ўсё мне здаецца, што калі-б я тады ведала, што за 3 кілометры адтуль, дзе я жыла, смяротна паранены памірае мой сын, я кінулася-б туды, каб сваімі рукамі перадушыць гадаў, якія стралялі ў дарагое мне дзіця.

— Пасля смерці сына мы з Маняй ужо не пакідалі партызанскага атрада. Мой аднарукі стрыечны брат таксама пайшоў у партызаны. Кажа: «Я ім таксама буду помсціць за смерць Толі». Уся наша сям'я—партызанская.

## БЕЛАРУСЬ ВАЮЕ!

Партызаны Міхаіла Іванавіча ўспамінаюць аб шматлікіх баявых аперацыях, аб тым, як нядаўна яны разграмілі завод. Тут-жа ся-

дзяць «віноўнікі» гэтых спраў—Рыгор Андрэевіч і Павел Аляксеевіч.

— Дзе гэта Іван? Будзе ён памятаць, як у нямецкім мундзіры ў бой хадзіць. Была ў нас работа разам з другім атрадам. Тыя хлопцы добра не ведалі нашых, дык здорава прыкладам агрэлі па галаве Івана. Ён у нямецкай форме быў, траха не забілі хлопца. Ледзьве ўратавалі мы яго.

— Цяжка жыве народ пад немцам,—уздыхнула партызанка Поля П. —Некалькі вёсак у нашым сельсовеце спалілі датла. У адной вёсцы забілі 22 чалавекі. Старыя сялянкі казалі мне, няхай-бы Чырвоная Армія пусціла «Кацюшу», якая-б усю немчуру знішчыла.

— Падаткі цяпер такія,—абзываецца стары партызан,—што і свет не бачыў... За сабаку—150 рублёў на год. Ды трымай сабаку на прывязі, або вадзі на ланцужку. А забі сабаку—штраф 1500 рублёў. Акно ў цябе на вуліцу глядзіць—плаці 25 рублёў. За дзверы —30 рублёў. За кошку плаці 80 рублёў. Нават, калі бараду хочаш насіць, дык і то плаці 15 рублёў на месяц. Дык дзе-ж ты вытрымаеш такую грабілаўку!..

— За фашыстамі жыццё горшае, як пры паншчыне! — сказаў другі партызан. —Чулі вы? Рыбу вудай і то забаранілі лавіць. На гэта трэба мець дазвол нямецкага каменданта. Трох хлопчыкаў у суседняй вёсцы застрэ-

лілі за тое, што яны паставілі нераты без дазволу немцаў.

Партызаны Міхаіла Іванавіча разграмілі валасную ўправу. Вось справы захопленыя пры разгроме ўправы. Загады і распараджэнні бургамістра раённай управы Ляснічага малююць жахлівую карціну абрабавання насельніцтва. Бяруць падатак за ўсё—за права пайсці да доктара і нават за тое, што напісаў заяву. А ў справе валаснай управы падшыта сотня заяў абрабаваных сялян з адзіным крыкам: «Хлеба!» «Ратуйце ад голаду!» Дайце хлеба!» На ўсіх гэтых заявах няма нават рэзалюцыі «адмовіць». Яны проста пакінуты без увагі.

Затое шмат аддадзена ўвагі рабунку сялян. Вось красамоўны дакумент: «Извещение. Гражданину Зусько Матрене. На основании приказа германского командования Вышедская волуправа обязывает вас сдать в Вышедскую управу следующее: Шарф. Срок сдачи 21/12—41 года. За несвоевременную сдачу будете строго отвечать по законам военного времени».

Але нават кат-паліцэйскі вымушаны зрабіць прыпіску на адносіне: «В такавой не имейтца авцы». Сапраўды, адкуль у жанчыны будзе шалік, калі ў яе няма нават авечкі—зжэрлі немцы.

Не пашанцавала немцам са зборам цёплых рэчаў у раёне. Вось вынікі: сабралі тры пары рукавіц, дзве пары шкарпэтак. Не хочуць людзі «ахвяраваць» нямецкай арміі цёплых рэчаў нават пад пагрозай пакарання па законах ваеннага часу. Ды не толькі шкарпэтак не даюць. З грозных папярэджанняў Ляснічага на адрас «пана начальніка валасной управы» відаць, што народ не здае бульбы, сена, збожжа. «Военные части требуют сена. А поступлений сена из вашей управы нет»,—пачынаецца адно з папярэджанняў Ляснічага, у якім «пан начальнік валасной управы» абзываецца нядбайным чалавекам і сабатажнікам. Ён такі нядбайны—гэты «пан начальнік управы». Нават поўных спісаў нямецкіх магіл не мог скласці. Выяўлены магілы, незарэгістраваныя ім. Нямецкія ўлады незадаволены. Ды хіба выявіш усе магілы нямецкіх катаў, калі іх тысячы і тысячы. Дарма тут вінавацяць «пана начальніка».

А наогул, справы ў яго ідуць усё горш і горш. Нарыхтоўкі не выконваюцца. Канчаецца ўсё грозным загадам нямецкага каменданта аб абвяшчэнні ўсёй воласці суцэльна-партызанскай. Загадваецца правесці перарэгістрацыю ўсяго мужчынскага насельніцтва ад 16 да 45 гадоў, з тым, каб яны былі пасланы на прымусовыя работы ў нямецкія лагеры. «Пока не наступит умиротворение волости».

— Пасля гэтага загаду,—кажа адзін партызан,—мы і апынуліся тут.

У справах валасной управы падшыты побач два дакументы. Фашысцкая лістоўка аб тым, як «прыемна» жывецца ў нямецкім палоне. Нават з малюнкамі. Таўстамордыя немцы, апранутыя ў чырвонаармейскую форму, ядуць суп. «Гарачы суп—прыемная рэч. Як даўно вы не атрымлівалі гэтага! — піша лістоўка. — А я зрабіў так». І той-жа немец з паднятымі рукамі здаецца ў палон немцам. «Цяпер я сыты і магу ад душы пасмяяцца». І тут-жа побач у справе валасной управы падшыта папера з штампам і пячаткай літаральна наступнага зместу:

«Председателю Соладухинской волостной управы.

Вам разрешает Езерищенская райполиция выдать 2-х худших лошадей для питания военнопленных лагеря Езерище.

Начальник Езерищенской райполиции Касьянов».

— Вось табе і рай у нямецкім палоне,—кажуць партызаны.—Дык-жа гэтых двух здохлых коней будуць дзяліць на некалькі тысяч чалавек. Палонным кінуць на харч адну карослівую скуру ад коней. Каб яны выдахлі з іх палонам! Лепш ужо ўдавіцца, чым да іх у палон трапіць.

— Ах, вельмі хочацца немчуры напасці на

нашы сляды, — азваўся малады партызан. —Але трасцу! Якія ўзнагароды яны не абяцалі насельніцтву—махорку, спірт і нават па 5 гектараў зямлі — нішто не дапамагло. Людзі хаваюць і берагуць нас. А як толькі немец з'явіцца ў вёсцы, нам адразу вядома. Мы тады і канчаем яго.

У гэты час увайшоў камандзір атрада:

— Хлопцы, хто сёння ідзе масты рамантаваць?

— Мы.

— Ну, дык пара, збірайцеся ў дарогу.

— Гэта ў нас так кажуць, калі трэба мост узарваць,—растлумачыў мне начальнік штаба Пётр Паўлавіч Е.

Пётр Паўлавіч Е. нядаўна прызначаны начальнікам штаба. У партызанскім атрадзе ён ад першага дня яго існавання. Быў байцом-партызанам, камандзірам узвода і камандзірам роты. Гэта чалавек гарачага сэрца і гарачай рукі. Лютай нянавісцю ён ненавідзіць здраднікаў. З імі ў яго размова простая:

— А ну, хлопцы, адпраўце яго ў штаб Крыжы № 2.

Гэта значыць — на той свет.

— Аднойчы,—кажа Пётр Паўлавіч,—іуда-здраднік, які сам расстрэльваў маленькіх дзяцей, шпіёніў і прадаваў, прыкінуўся ягнём.

— Я вінаваты. Але дайце мне, Пётр Паўлавіч, заданне...

— У мяне закіпела сэрца,—кажа таварыш Е.,—я ўспомніў, як ён здзекваўся з дзяцей, не шкадаваў старых жанчын. Я падышоў да яго і выстраліў у грудзі, ва ўпор:

— Вось табе маё заданне!

Наша гутарка зацягнулася за поўнач. Перада мной праходзілі чалавечыя жыцці, іх трагедыі і радасці.

Перад вачыма стаіць тройка храбрацоў, якія, акружаныя ў пуні 80 немцамі, не здаліся, а гранатамі і вінтоўкамі пракладвалі сабе шлях. У гэтай бойцы загінуў бясстрашны чалавек—Гуляеў Пётр Максімавіч. З варожага кальца ўдалося вырвацца толькі дваім: Пётру Навумавічу М. і параненаму ў бойцы Федзяёву Івану Іванавічу. Яны знішчылі некалькі дзесяткаў немцаў. Федзяёў загінуў пачэснай смерцю ў адным з баёў. Вось сядзіць яго жонка. Яна ўзяла вінтоўку мужа, каб помсціць. Калі ўспамінаюць пра блізкага ёй чалавека, яна закусвае губу, стрымліваючыся, каб не заплакаць.

— Досыць сумнага! — гаворыць Сенечка. —Дайце гармонік!—І пад умелымі рукамі паліліся гукі беларускіх песень. Мы спяваем «А ў полі вярба», «Што за месяц, што за ясны», «Ой расцвіла ружа». Як-жа соладка спяваць родную песню тут, на роднай зямлі! Няхай чуе яе вораг, які знаходзіцца побач. Жыве Совецкая Беларусь! Змагаецца, ваюе! Носьбі-

тамі яе славы, гонару, культуры з'яўляюцца беларускія партызаны. Яны распраўляюцца з фашыстамі, якія люта ненавідзяць беларускі народ. Дайшла-ж нямецкая брыда да такога здзеку з нашага народа, што ў Оршы адкрыла краму лапцей з шыльдай: «Лапці толькі для беларусаў».

Ужо світае, калі мы з Сенечкам выходзім з хаты.

— А што, добра ў нас?—пытае Сенечка.
—Люблю наша партызанскае жыццё. Быў, выкладчыкам фізікі і матэматыкі, нават не ваеннаабавязаны. Але калі пабачыў, што за подлыя жывёлы гэтыя немцы, не мог стрываць. Па-першае, агідна было слухаць іх брахлівую прапаганду, нястрымную пахвальбу. Я зрабіў радыёпрыёмнік і пачаў слухаць совецкае радыё. Затым людзі прыходзілі да мяне, як да настаўніка параіцца. Мусіў-жа я казаць ім праўду. А раз праўду гаворыш—значыць, партызан. Ну, і ліха з вамі, дык стаў я сапраўды партызанам. І страляць навучыўся. Вы-ж, мусіць, ведаеце, што наш раён аб'яўлен немцамі па-за законам, як суцэльны партызанскі.

Я ішоў перадыхнуць пару гадзін і думаў пра Міхаіла Іванавіча, чалавека нязломнай волі, які аб'яднаў гэтых людзей у моцны баявы калектыў.

Ужо зусім развіднела. «Рамонтнікі» мастоў вярнуліся з працы, і нястомны Міхаіл Іванавіч

гаварыў з імі пра вынікі «рамонту». Дзесьці чуваць былі глухія ўзрывы. Гэта заложаныя «рамонтнікамі» міны рабілі сваю справу. Яшчэ далей бесперастанку гаварылі гарматы і мінамёты. Сонца ўставала яснае і празрыстае, як заўтрашні дзень Беларусі.

Воіны Чырвонай Арміі ішлі на Захад.

★

## ЗМЕСТ

Стар.

Родныя мясціны . . . . . . . . . . . . . . . . 3
Бацька Мінай . . . . . . . . . . . . . . . . 9
«Артылерыя, агонь!» . . . . . . . . . . . . . . 16
У атрадзе Аляксея і Данілы . . . . . . . . . . . 23
Песня . . . . . . . . . . . . . . . . . . 30
«Не лезьце ў наш партызанскі край» . . . . . . . . 34
«Пан упраўляючы» . . . . . . . . . . . . . . 39
Анатоль Кірылаў . . . . . . . . . . . . . . . 44
Расказ маці . . . . . . . . . . . . . . . . 50
Беларусь ваюе! . . . . . . . . . . . . . . . 53

★

Рэдактар **П. Глебка.**

Падпісана да друку 22/IX 1943 г.
А-2731. 2 друк. аркушы
Тыраж 10.000 экз. Заказ № 407

Друкарня «Известий»
Масква

1 р. 50 к.